УДК 37:930(476)(035.3)

**В. І. Крывуць**
Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы

# УЗАЕМААДНОСІНЫ КАТАЛІЦКАГА КАСЦЁЛА І ПОЛЬСКІХ УЛАД У ПРАЦЭСЕ РЭАЛІЗАЦЫІ АФІЦЫЙНАЙ МАЛАДЗЁЖНАЙ ПАЛІТЫКІ НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў МІЖВАЕННЫ ПЕРЫЯД

Праблема маладзёжнай палітыкі і ўзаемадзеянне ў ходзе яе рэалізацыі дзяржавы і грамадскіх інстытутаў заўсёды будзе захоўваць актуальнасць. Таму існуе неабходнасць вывучэння вопыту мінулага ў дадзенай сферы. У поўнай меры гэта адносіцца і да ўзаемаадносін, якія склаліся ў міжваенны перыяд на тэрыторыі Заходняй Беларусі паміж польскімі ўладамі і каталіцкім касцёлам у час іх працы ў маладзёжным асяроддзі рэгіёна. Аднак гэтая праблематыка не знайшла яшчэ належнага адлюстравання ў айчыннай гістарыяграфіі. Некаторыя яе бакі часткова закраналіся ў надрукаванай яшчэ ў савецкі час манаграфіі Я. Н. Мараша [1]. Больш падрабязна ўзаемаадносіны дзяржавы і каталіцкіх структур у кантэксце маладзёжнай палітыкі разглядаліся ў польскай гістарыяграфіі, але польскія даследчыкі фактычна не надавалі ўвагі заходнебеларускай спецыфіцы. У сувязі з гэтым склалася даволі спрошчанае і стэрэатыпнае ўяўленне адносна дадзенай праблемы, што, у сваю чаргу, выклікае неабходнасць даць, абапіраючыся на шырокую дакументальную базу, больш аб'ектыўную яе характарыстыку. Гэта і з'ўляецца галоўнай мэтай артыкула.

Неабходна адразу адзначыць, што каталіцкі касцёл карыстаўся вялікім уплывам сярод насельніцтва міжваеннай Заходняй Беларусі. Заходнебеларускія ваяводствы ўваходзілі ў склад Віленскай мітраполіі і складалі Віленскую архідыяцэзію і дыяцэзіі ў Пінску і Ломжы [1, с. 35]. Найбольшая колькасць католікаў прыпадала на Віленскае ваяводства — 61,2 % насельніцтва. У Навагрудскім ваяводстве яны складалі 39,5 %, а ў Палескім — 7,8 % [2, с. 31—32]. Пры гэтым каталіцкі касцёл займаў прывілеяванае становішча ў параўнанні з іншымі канфесіямі, што дазваляла яму весці значную працу сярод насельніцтва, у тым ліку і выхаванне маладога пакалення.

Адносіны каталіцкага касцёла да выхавання моладзі былі сфармуляваны ў энцыкліцы Рымскага Папы Пія XI «Дівіні ілліус магістры» (1929). Гэтая энцыкліка з'яўлялася першым афіцыйным выкладаннем выхаваўчай канцэпцыі каталіцызму. Папскі дакумент асуджаў ўсе педагагічныя сістэмы, якія не прызнавалі першародны грэх і божую міласць. Прыхільнікі такіх сістэм, на думку Папы, займаюцца не пазітыўным фарміраваннем чалавека, а вызваленнем яго ад уплыву божых запаветаў. Энцыкліка вызначала, хто павінен займацца выхаваннем — Царква, сям'я і дзяржава. Пры гэтым вядучая роля адводзілася менавіта Царкве, а сям'я і дзяржава павінны былі падпарадкоўвацца ёй у выхаваўчай сферы. Сцвярджалася, што хрысціянскае выхаванне мае ўніверсальны характар. Прынцыповай жа мэтай гэтага выхавання з'яўлялася фарміраванне «сапраўднага і дасканалага хрысціяніна» [3, с. 180].

Згодна з энцыклікай, галоўным абавязкам дзяржавы з'яўлялася падтрыманне ўсімі сродкамі выхавання, якое арганізавана касцёлам і сям'ёй. Пры гэтым Папа заяўляў, што «чым больш сціслa свецкая ўлада супрацоўнічае з уладай духоўнай, дапамагае ёй і падтрымлівае, тым больш яна мае дачынення да захавання Дзяржавы» [3, с. 184]. Лічылася, што выхаванне добрага хрысціяніна азначае і выхаванне добрага грамадзяніна. У энцыкліцы адзначалася, што «католік, дзякуючы таму, што ён выхаваны згодна з каталіцкімі прынцыпамі, з'ўляецца найлепшым грамадзянінам, які любіць сваю Айчыну і па-сапраўднаму лаяльны ў адносінах да дзяржаўнай улады, незалежна ад формы кіравання» [3, с. 186].

Але такі падыход супярэчыў канцэпцыі так званага «дзяржаўнага выхавання», якую прыняў на ўзбраенне «санацыйны» рэжым міжваеннай польскай дзяржавы. Тагачасныя польскія ўлады адводзілі кіруючую ролю ў выхаванні моладзі менавіта дзяржаўным структурам, школе і праўрадавым маладзёжным аб'яднанням. Прэтэнзіі касцёла выклікалі незадаволенасць шэрагу прадстаўнікоў пануючага рэжыму. Напрыклад, рашучым праціўнікам выхаваўчага ўздзеяння Царквы быў адзін з ідэолагаў «дзяржаўнага выхавання», міністр адукацыі Я. Енджэевіч. Ён абвінавачваў каталіцкі касцёл у выкарыстанні амвона ў якасці «пасляховага сродку выбарчай агітацыі», а таксама ў распаўсюджванні нацыяналізму, антысемітызму і агітацыі, напраўленай супраць маршала Ю. Пілсудскага. Урадавая выхаваўчая мадэль, сцвярджаў Я. Енджэевіч, павінна стаяць вышэй выхаваўчых ідэалаў, якія прапагандуе касцёл і асобныя палітычныя партыі [4, с. 120—121]. Ён лічыў, што «дзяржаўнае выхаванне не з'ўляецца выражэннем якой-небудзь пэўнай грамадскай дактрыны, рэлігійнай веры ці філасофскага светапогляду. Яно бярэ свой змест з жыцця і абапіраецца на фактычную сістэму адносін, якія склаліся на дадзены момант». На яго думку, задачай выхавання з'яўлялася не ажыццяўленне ідэальных праграм грамадскага жыцця, а падрыхтоўка моладзі да той рэчаіснасці, якая існуе ў дадзеным месцы і часе, існуе на самой справе [5, с. 314].

Нягледзячы на прэтэнзіі з боку «санацыйных» улад, каталіцкае духавенства вяло актыўную дзейнасць у маладзёжным асяроддзі. Гэтая праца ажыццяўлялася ў межах Каталіцкай акцыі, якая павінна была садзейнічаць укараненню ў грамадстве асноўных ідэй каталіцкай сацыяльнай дактрыны і пашыраць грамадскую базу

© Крывуць В. І., 2019



Репозиторий БарГУ

каталіцкай царквы. У Заходняй Беларусі мерапрыемствы Каталіцкай акцыі пачалі ажыццяўляцца з сярэдзіны 1920-х гг. Канчаткова яе арганізацыйнае афармленне адбылося ў пачатку 1930-х гг., калі пачалі дзейнічаць інстытуты Каталіцкай акцыі ў дыяцэзіях, у тым ліку і ў Вільні. Асновай Каталіцкай акцыі ў міжваеннай польскай дзяржаве сталі чатыры калоны, якія аб’ядноўвалі адпаведна дарослых мужчын, дарослых жанчын, юнакоў і дзяўчат. Акрамя таго, з рухам супрацоўнічаў і шэраг іншых клерыкальных аб’яднанняў [6, с. 231—232].

Найбольш буйной клерыкальнай маладзёжнай арганізацыяй было Аб’яднанне польскай моладзі (АПМ). Яно ўзнікла ў 1919 г. у Познані, а на тэрыторыі Заходняй Беларусі яго гурткі з’явіліся ў 1926 г. [7, арк. 476]. У 1934 г. у сувязі з уніфікацыяй калон Каталіцкай акцыі адбылася рэарганізацыя аб’яднання: былі створаны асобныя арганізацыі для юнакоў і дзяўчат — Каталіцкае аб’яднанне мужчынскай моладзі (далей — КАММ) і Каталіцкае аб’яднанне жаночай моладзі (КАЖМ) [8, с. 1113].

У гэтыя арганізацыі ўваходзіла каталіцкая моладзь ва ўзросце 14—25 гадоў. У Заходняй Беларусі да 80 % членаў аб’яднанняў складалі сельскія жыхары [7, арк. 476]. Ячэйкі ствараліся пры прыходах, потым ішлі павятовыя саюзы, потым — акруговыя. На тэрыторыі Заходняй Беларусі існавалі акругі з цэнтрамі ў Вільні, Сакулцы і Лідзе. На кожным узроўні існавала пасада царкоўнага асістэнта, які з’яўляўся прадстаўніком епіскапа [9, с. 6].

У статутных дакументах арганізацыі заяўлялася, што асноўная яе мэта — выхаванне адукаваных і актыўных членаў каталіцкай царквы, падрыхтоўка іх да хрысціянскага служэння, распаўсюджванне каталіцкіх прынцыпаў ва ўсіх сферах жыцця і культуры [10, с. 3]. Асноўнымі формамі працы былі: удзел у рэлігійнай практыцы, сходы, з’езды, развіццё кааперацыі, сельскагаспадарчыя і прафесійныя курсы, ваенная падрыхтоўка, спорт і г. д. [11, с. 77—78].

АПМ, а потым КАММ і КАЖМ заяўлялі пра сваю апалітычнасць, што незаўсёды адпавядала рэчаіснасці. У канцы 1920-х гг. у арганізацыі быў даволі моцным уплыў польскіх хрысціянскіх дэмакратаў і нацыяналістаў, якія знаходзіліся ў апазіцыі да рэжыму Ю. Пілсудскага. Але ў Заходняй Беларусі гэтыя партыі не карысталіся аўтарытэтам і былі слаба прадстаўлены ў гуртках АПМ. Канчаткова свецкія партыі былі выцеснены ў пачатку 1930-х гг. пасля рашэння Пія XI ізаляваць Каталіцкую акцыю ад якога-небудзь палітычнага ўплыву. Таму царкоўныя ўлады правялі своеасаблівую чыстку АПМ [11, с. 79]. Як адзначала справаздача беластоцкіх ваяводскіх улад восенню 1932 г., каталіцкае духавенства з’яўлялася «арганізацыйным рухавіком» АПМ. Тая ж справаздача прызнавала, што АПМ не здолела знайсці моцнай падтрымкі ў старэйшага пакалення па-за коламі, якія знаходзіліся пад уплывам Царквы [12, арк. 144].

Дзейнасць клерыкалаў не абмяжоўвалася толькі маладымі вяскоўцамі. Пэўная праца вялася сярод студэнтаў. У 1928 г. спачатку ў Варшаве, а потым і ў іншых універсітэцкіх цэнтрах узнікла так званае акадэмічнае духавенства. Яно не абмяжоўвалася традыцыйнай рэлігійнай практыкай, але займалася і каардынацыяй дзейнасці студэнцкіх арганізацый [13, с. 426]. У Віленскім універсітэце імя С. Баторыя найбольш уплывовай клерыкальнай арганізацыяй было Аб’яднанне каталіцкай акадэмічнай моладзі (далей — АКАМ) «Адраджэнне», мэтай якога было выхаванне ў каталіцкім духу будучых грамадскіх і палітычных дзеячаў [14, с. 126]. АКАМ «Адраджэнне» ўзнікла яшчэ да Першай сусветнай вайны, з 1919 г. яно пачало распаўсюджваць сваю дзейнасць ва ўніверсітэтах. У Вільні аддзяленне арганізацыі з’явілася ў 1921 г. Як і іншыя маладзёжныя каталіцкія саюзы, АКАМ «Адраджэнне» з’яўлялася часткаю Каталіцкай акцыі, але захоўвала адносную аўтаномію [15, с. 90].

Дзейнасць АКАМ «Адраджэнне» дзялілася на ўнутраную і знешнюю. Унутранае жыццё арганізацыі адбывалася ў чатырох секцыях: кандыдацкай, філасофска-рэлігійнай, грамадскай і нацыянальнай. Знешняя дзейнасць канцэнтравалася ў двух накірунках: авалоданне ўменнямі паспяховай грамадскай дзейнасці і ўвядзенне хрысціянскага акцэнту ў ідэйна нейтральныя ці нават варожыя каталіцызму колы. Такім чынам, члены арганізацыі набывалі сацыяльны вопыт, які выкарыстоўваўся спачатку ў студэнцкім, а ў перспектыве у афіцыйным грамадска-палітычным жыцці [14, с. 127—129].

Пад уплывам клерыкалаў знаходзіліся і студэнцкія карпарацыі, якія ўваходзілі ў склад Аб’яднання польскіх акадэмічных хрысціянскіх карпарацый (АПАХК), створанага ў кастрычніку 1924 г. Карпарацыі, якія ўваходзілі ў склад дадзенага аб’яднання, імкнуліся правесці рэформу карпарацыйнага руху ў імя хрысціянскай этыкі. Менавіта гэтая этыка павінна была быць «компасам» дзейнасці нацыі, адыгрываць важную ролю ў індывідуальным і калектыўным жыцці. Таксама лічылася, што карпарацыі павінны разгарнуць грамадскую працу за межамі ўніверсітэтаў [16, с. 119—120]. У Вільні ў міжваенны перыяд існавалі дзве хрысціянскія карпарацыі — «Снядэцыя» і «Конрадзія» (абедзве ўзніклі ў 1926 г.). У ідэйнай дэкларацыі апошняй было заяўлена, што свой светапогляд яна будуе на хрысціянскай веры і філасофіі, якія з’яўляюцца крыніцай творчай чалавечай думкі. Таксама адзначалася, што «крыніцай гонару з’яўляецца каталіцкая этыка» [16, с. 189—190].

Неабходна адзначыць, што ў 1931 г. у Віленскім універсітэце па ініцыятыве ксяндзоў В. Мейштовіча і Г. Глябовіча ўзнікла мясцовае Пагадненне акадэмічных каталіцкіх аб’яднанняў, у якое ўвайшлі ўсе клерыкальныя студэнцкія арганізацыі. Яго мэтай было супрацоўніцтва ў сферы рэлігійнага жыцця студэнтаў (сумесныя набажэнствы, паломніцтвы і г. д.), а таксама сумесныя выступленні на арэне агульнаўніверсітэцкага жыцця [17, с. 270—271].

Каталіцкі маладзёжны рух набыў значны размах на тэрыторыі Заходняй Беларусі. На пачатак 1930-х гг. АПМ налічвала тут 11 500 членаў у 587 гуртках і 1 300 апекуноў у акруговых і павятовых патранатах [7, арк. 477]. Аднак неабходна адзначыць, што многія гурткі існавалі толькі на паперы. Напрыклад, юнацкі гурток АПМ у Баранавічах быў створаны ў 1931 г., але паўнавартасную працу пачаў толькі ў 1936 г. [18, с. 109].



Рэпазіторый БарДУ

Адным з галоўных накірункаў працы клерыкальных маладзёжных арганізацый была рэлігійная дзейнасць. У астатнім гэтая праца шмат у чым супадала з асноўнымі накірункамі дзейнасці праўрадавых маладзёжных саюзаў — ваеннай падрыхтоўкай, сельскагаспадарчай асветай, патрыятычным выхаваннем у паланізатарскім духу. Каталіцкія аб'яднанні нейкі час нават займалі вядучыя пазіцыі ў конкурснай акцыі па сельскагаспадарчай падрыхтоўцы маладога пакалення ў Віленскім ваяводстве. Вялікая ўвага надавалася і ваеннай падрыхтоўцы моладзі. Так, у красавіку 1932 г. на VII з'ездзе АПМ была прынята спецыяльная рэзалюцыя па пытанні ваеннай падрыхтоўкі (далей — ВП) і фізічнага выхавання (ФВ). У ёй было заяўлена, што каталіцкія аб'яднанні павінны стаяць у першых шэрагах абаронцаў дзяржавы на яе ўсходніх рубяжах. У сувязі з гэтым прадугледжвалася стварэнне гурткоў ВП і ФВ пры кожным гуртку АПМ [19, с. 12].

Але пры правядзенні акцыі ВП клерыкальныя аб'яднанні сутыкаліся з канкурэнцыяй з боку праўрадавых арганізацый, у першую чаргу Стралецкага саюза «Стралец». Таксама мелі месца выпадкі, калі ў час заняткаў па ВП членаў каталіцкіх арганізацый без іх згоды і ведама аўтаматычна запісвалі ў Стралецкі саюз. У сувязі з гэтым царкоўнае кіраўніцтва нават было вымушана выдаць спецыяльны цыркуляр для сваіх павятовых арганізацый [20, с. 18].

Як і іншыя маладзёжныя арганізацыі, АПМ вяло актыўную культурна-асветніцкую дзейнасць, якая мела адкрыты паланізатарскі характар. Паланізатарская накіраванасць АПМ на тэрыторыі Заходняй Беларусі выразна выявілася ў 1931 г. у час перапісу насельніцтва. Віленскае кіраўніцтва аб'яднання заклікала сваіх членаў прыняць актыўны ўдзел у перапісе і зрабіць асаблівы націск на «дакладнасць інфармацыі» адносна роднай мовы, якую мясцовае насельніцтва называла «тутэйшай». Інструкцыя АПМ падкрэслівала, што ніякай «тутэйшай» мовы няма: «Мова, якую выкарыстоўваюць на нашых землях, з'яўляецца адной з гаворак польскай мовы, як гуральская, мазурская, кашубская, такім чынам, яна з'яўляецца польскай мовай» [21, с. 21—22]. У выніку беларуская мова ператваралася ў польскую, а мясцовыя беларусы — у палякаў.

Нягледзячы на паланізатарскую і дзяржаўніцкую пазіцыю клерыкальных аб'яднанняў моладзі, іх адносіны з польскімі ўладамі і праўрадавымі аб'яднаннямі моладзі былі даволі напружанымі. Вядома, што каталіцкі касцёл актыўна крытыкаваў антыклерыкальнае крыло «санацыйнага» лагера і звязаныя з ім арганізацыі — Легіён маладых (далей — ЛМ), Саюз сельскай моладзі «Сеў», Саюз маладой вёскі (далей — СМВ), Стралецкі саюз [22, с. 406—407]. Асабліва востра клерыкальная прэса атакавала ЛМ. Дадзеная арганізацыя абвінавачвалася ў тым, што яе праграма прадугледжвае барацьбу з каталіцкім духавенствам, усталяванне залежнасці касцёла ад дзяржавы, адмену царкоўных шлюбаў. Таксама заяўлялася, што ў сацыяльнай сферы праграма ЛМ не вельмі адрозніваецца ад бальшавізму. У лютым 1934 г. у спецыяльным пастырскім лісце польскіх епіскапаў гаварылася, што «аб'яднанне пад назвай Легіён маладых стала на камуністычную пазіцыю» і трэба «лічыць Легіён маладых аб'яднаннем, якое асуджаецца Касцёлам згодна з кананічным правам». Католікам забаранялася быць членамі гэтай арганізацыі. Каталіцкая прэса папярэджвала бацькоў ад запісвання сваіх дзяцей у ЛМ, паколькі «ваўкі ахвотна нацягваюць авечую скуру» [23, с. 2].

У адказ прадстаўнікі дзяржаўнай сістэмы адукацыі ўказвалі на апазіцыйны характар АПМ і не рэкамендавалі настаўнікам падтрымліваць яго, паколькі «гэтая арганізацыя выкарыстоўваецца духавенствам для барацьбы з ідэалогіяй Саюза сельскай моладзі» [24, арк. 10; 25, с. 242].

Як сведчаць архіўныя крыніцы, «санацыйныя» арганізацыі і польскія ўлады часта цярпелі паразу ў канкурэнцыі з клерыкаламі. Іншы раз, як гэта здарылася ў Слоніме ў 1933 г., ксяндзам нават удавалася прыцягнуць членаў праўрадавых арганізацый, выкарыстоўваючы іх рэлігійныя пачуцці, да фінансавання клубаў (святліц) каталіцкіх маладзёжных саюзаў [26, арк. 9]. Афіцыйныя справаздачы паведамлялі пра тое, што на тэрыторыі Беластоцкага ваяводства каталіцкае духавенства вяло адкрытую агітацыю супраць праўрадавых саюзаў прама з амвона, адначасова заклікаючы ўступаць у шэрагі АПМ ці арганізацый, звязаных з польскімі нацыяналістамі. Таксама адзначаліся і выпадкі байкоту духавенствам членаў Стралецкага саюза і іх сямей [27, арк. 47; 28, с. 2]. Падобная варожасць каталіцкага кліру ў адносінах да «Стральца» існавала ў пачатку 1930-х гг. і на тэрыторыі Віленскага ваяводства [29, с. 4]. Асаблівую незадаволенасць каталіцкага духавенства выклікала стварэнне жаночых атрадаў Стралецкага саюза. Так, ксёндз у Косаве Палескага ваяводства заявіў, што гэта азначае «ўцягванне маладых дзяўчат у гандаль жывым таварам» [30, с. 288].

Афіцыйная прэса сцвярджала, што ксяндзы, якія сімпатызуюць Стралецкаму саюзу, спецыяльна пераводзяцца царкоўнымі ўладамі ў аддаленыя прыходы, а праціўнікі дадзенай арганізацыі наадварот заахвочваюцца [31, с. 2]. Справаздача Віленскага ваяводскага аддзялення СМВ сярод перашкод на шляху развіцця арганізацыі асобна называла «атакі духавенства, выкліканыя, верагодна, ростам нашай арганізацыі і ўсе большая ідэйнай свядомасцю яе членаў» [32, с. 12].

У студзені 1932 г. справаздачы беластоцкіх ваяводскіх улад адзначалі выпадкі фізічнага гвалту членаў АПМ у адносінах да стральцоў у Беластоцкім і Ваўкавыскім паветах. У гэты перыяд у выніку прапаганды ксяндзоў і адмовы ў споведзі там самаліквідаваліся некалькі атрадаў «Стральца» [33, арк. 8]. Іншы раз канфлікт з духавенствам мог прывесці да трагедыі: у маі 1933 г. у Беластоцкім павеце ў выніку кампаніі, арганізаванай ксяндзом, скончыў жыццё самагубствам інструктар ВП [27, арк. 115]. Тым не менш пасля ўніфікацыі «санацыйных» саюзаў вясковай моладзі афіцыйныя справаздачы адзначалі і факты пераходу маладых католікаў у СМВ. Так, у справаздачы беластоцкага ваяводы за кастрычнік 1935 — сакавік 1936 гг. паведамлялася, што «некаторыя з членаў каталіцкіх аб'яднанняў моладзі, стомленыя праграмай працы, перагружанай рэлігійнай тэматыкай, пераходзяць у Саюз маладой вёскі» [34, арк. 3—4].



Рэпазіторый БарДУ

Напружанае становішча пачало мяняцца ў сярэдзіне 1930-х г. Менавіта ў гэты час «санацыя» пачала мадыфікацыю сваёй выхаваўчай дактрыны ў накірунку прыняцця некаторых каталіцкіх ідэй. Палітыка Я. Енджэевіча і яго паплечнікаў пачала падвяргацца крытыцы нават з боку прадстаўнікоў «санацыйнага» лагера. Напрыклад, сцвярджалася, што ў працэсе выхавання вельмі мала ўвагі надавалася нацыянальным і каталіцкім каштоўнасцям [35, с. 60]. Новы міністр адукацыі У. Свентаслаўскі заяўляў, што «няма дзяржаўнага выхавання без уліку рэлігійна-маральных каштоўнасцей». Па яго словах, выхаванне павінна было абапірацца у тым ліку і на вялікія дасягненні хрысціянскай этыкі [36, с. 93].

Польскія ўлады зрабілі і шэраг практычных крокаў, накіраваных на аблягчэнне існавання КАММ і КАЖМ. Так, у адпаведнасці з дэкрэтам ад 14 лістапада 1935 г. філіялы гэтых саюзаў атрымалі некаторыя льготы, у тым ліку вызваленне ад выплаты падаткаў за свае памяшканні [1, с. 53—54].

Адначасова царкоўная іерархія наладзіла паспяховае супрацоўніцтва з польскай арміяй. Яна пайшла на гэта нават коштам прызнання «Стральца». У 1936 г., калі Дзяржаўнае праўленне ФВ і ВП прыпыніла супрацоўніцтва з КАММ, генерал Т. Каспржыцкі, кіраўнік дадзенай установы, па асабістай просьбе кардынала А. Глонда, прымаса Польшчы, загадаў аднавіць гэтае супрацоўніцтва. Пры гэтым ваеннае навучанне сваіх членаў КАММ магло весці толькі ў атрадах Стралецкага саюза [37, с. 65].

Што тычыцца клерыкальных студэнтаў Віленскага ўніверсітэта, то тут «санацыйныя» ўлады і царкоўная іерархія мелі пэўныя праблемы. У канцы 1920-х гг. у віленскім аддзяленні АКАМ «Адраджэнне», кіраўніком якога з'яўляўся Г. Дэмбіньскі, адбывалася ідэйная радыкалізацыя. Студэнты-католікі ўступілі ў канфлікт з польскімі нацыяналістамі, пачалі барацьбу за абмежаванне іх уплыву ва ўніверсітэце. Адначасова адбылося некаторае збліжэнне з радыкальна настроенымі праўрадавымі арганізацыямі, у тым ліку с ЛМ [38, с. 34]. Гэта адрознівала віленскае АКАМ «Адраджэнне» ад іншых універсітэтаў, дзе студэнты-католікі варожа ставіліся да свецкіх, антыклерыкальных і радыкальных арганізацый праўрадавай моладзі і, наадварот, цесна супрацоўнічалі з польскімі нацыяналістамі.

Першапачаткова, у 1931/1932 навучальным годзе, прыхільнікі Г. Дэмбіньскага здолелі перамагчы на выбарах праўлення студэнцкага самакіравання і адхіліць ад улады польскіх нацыяналістаў з крайне правай Усепольскай моладзі (УМ). Але потым, на хвалі антысеміцкіх выступленняў, УМ ажыццявілі рэванш. Дарэчы, рашаючую ролю ў перамозе нацыяналістаў адыграла пазіцыя Віленскага епіскапата: ён дазволіў прыняць удзел у выбарах студэнтам-тэолагам, якія і аддалі свае галасы за УМ. Пры гэтым перавага была мінімальнай — каля трыццаці галасоў. Як адзначалі сучаснікі, «на выбарах перамог архіепіскап Ялбжыкоўскі і клірыкі» [39, с. 75—76].

У асяроддзі саміх віленскіх студэнтаў-католікаў адбыўся раскол. Царкоўныя ўлады адмовіліся падтрымліваць Г. Дэмбіньскага і яго прыхільнікаў, якія пачалі дэклараваць даволі радыкальную антыўрадавую праграму. Пасля таго, як агульнапольскае кіраўніцтва АКАМ «Адраджэнне» асудзіла гэтую праграму, «група Дэмбіньскага» выйшла з арганізацыі. У далейшым яна склала аснову блізкага да камуністаў саюза «Фронт».

Аднак АКАМ «Адраджэнне» не спыніла свайго існавання ў Вільні. Арганізацыя вярнулася на пазіцыі каталіцкай сацыяльнай дактрыны, нейтралітэта ў адносінах з польскімі нацыяналістамі і супрацоўніцтва з кіруючым рэжымам. Віленскія студэнты-католікі значна знізілі сваю актыўнасць. Найбольш заметнай яе праявай было выданне часопіса «Пакс», радыкалізм якога не выходзіў за межы папскіх энцыклік [40, с. 117].

Такім чынам, можна пагадзіцца з тым, што каталіцкі маладзёжны рух, інспіраваны царкоўнай іерархіяй, атрымаў даволі інтэнсіўнае развіццё на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд. Пад уплывам створанага ў межах Каталіцкай акцыі АПМ, а потым КАММ і КАЖМ знаходзілася значная колькасць маладых сялян каталіцкага веравызнання. У асноўных сваіх накірунках дзейнасць клерыкальных аб'яднанняў супадала з дзейнасцю праўрадавых арганізацый моладзі, у тым ліку шмат увагі надавалася і паланізацыі маладых беларусаў. Разам з тым рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі перашкаджала пэўная канкурэнцыя паміж каталіцкімі і «санацыйнымі» арганізацыямі, а таксама супрацьстаянне царкоўнай іерархіі і прадстаўнікоў улады. Аднак у асноўным гэтая канкурэнцыя была пераадолена ў другой палове 1930-х гг. Даволі слабымі аказаліся пазіцыі клерыкалаў сярод віленскага студэнцтва. Віленскі філіял АКАМ «Адраджэння» перажыў раскол. Найбольш радыкальныя яго члены ў далейшым перайшлі нават на пракамуністычныя пазіцыі, што, у сваю чаргу, адмоўна адбілася на спробах «санацыі» ўзмацніць свой уплыў ва ўніверсітэце.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. *Мараш, Я. Н.* Политика Ватикана и католической церкви в Западной Белоруссии (1918—1939) / Я. Н. Мараш. — Минск : Беларусь, 1983. — 96 с.

2. *Ярмусик, Э. С.* Католический костел в Западной Беларуси в годы Второй мировой войны (1935—1945) / Э. С. Ярмусик. — Гродно : ГрГУ, 2002. — 240 с.

3. *Grochowski, L.* Doktryna wychowawcza katolicyzmu w Polsce międzywojennej / L. Grochowski // Rozprawy z dziejów oświaty. — 1984. — T. XXV. — S. 173—206.

4. *Osiński, Z.* Janusz Jędrzejewicz — piłsudzyk i reformator edukacji / Z. Osiński. — Lublin : WydawnictwoUMCS, 2008. — 338 s.

5. *Jędrzejewicz, J.* Wychowanie Państwowe / J. Jędrzejewicz // Zrąb. — 1930. — T. 1. — S. 311—320.

6. Akcja Katolicka // Encyklopedia katolicka. — Lublin : TN KUL, 1995. — T. 1. — S. 227—233.

7. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 242 п. Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ. — Воп. 1. — Спр. 305.

8. Katolickie stowarzyszenia // Encyklopedia katolicka. — Lublin : TN KUL, 2000. — T. 8. — S. 1093—1118.

9. Statut Katolickiego Stowarzyszenia Młodzieży Męskiej. — Poznań : Nakładem Spółki Akcyjnej "Ostoja", 1934. — 16 s.

10. Statut Katolickiego Stowarzyszenia Młodzieży Żeńskiej. — Poznań : Nakładem Spółki Akcyjnej "Ostoja", 1934. — 16 s.

11. *Pruszkowski, A.* Przewodnik społeczny / A. Pruszkowski. — Warszawa : Druk. P. Brzeziński, 1934. — 292 s.




Рэпазіторый БарДУ

12. Archiwum Państwowe w Białymstoku (APB). — Z. 47. Urząd Wojewódzki Białostocki (1920 — 1939). — Sygn. 67. Miesięczne sprawozdania sytuacyjne z zakresu bezpieczeństwa publicznego, ruchu wywrotowego i ruchu zawodowego za 1932 r.

13. *Mysłek, W.* Kościół katolicki w Polsce w latach 1918—1939 / W. Mysłek. — Warszawa : Książka i Wiedza, 1966. — 670 s.

14. *Luter, A.* Stowarzyszenie Katolickiej Młodzieży Akademickiej "Odrodzenie" w Wilnie jako prekursor ekumenizmu i dialogu katolicko-żydowskiego w Polsce / A. Luter // Forum teologiczne. — 2006. — T. VII. — S. 125—138.

15. Słownik organizacji młodzieżowych w Polsce 1918—1970 / Cz. Kozlowski [i in.] ; pod red. Cz. Kozlowskiego. — Warszawa : Iskry, 1971. — 191 s.

16. *Tomaszewski, P.* Polskie korporacje akademickie w latach 1918—1939. Struktury, myśl polityczna, działalność / P. Tomaszewski. — Toruń : CYCERO.PL, 2011. — 516 s.

17. *Gajewski, S.* Katolickie organizacje akademickie w II Rzeczypospolitej / S. Gajewski. — Lublin : Redakcja Wydawnictw KUL,1987. — 330 s.

18. Chrześcijański kalendarz-przewodnik Baranowicki na rok 1937. — Wilno : Znicz, 1936. — 186 s.

19. Związek Młodzieży Polskiej // Wiadomości Akcji Katolickiej Archidiecezji Wileńskiej. — 1932. — № 5. — S. 9—24.

20. Związek Młodzieży Polskiej // Wiadomości Akcji Katolickiej Archidiecezji Wileńskiej. — 1932. — № 6. — S. 5—21.

21. Związek Młodzieży Polskiej // Wiadomości Akcji Katolickiej Archidiecezji Wileńskiej. — 1931. — № 5. — S. 15—30.

22. *Kołodziejczyk, A.* Ruch ludowy a Kośiół rzymskokatolicki w latach II Rzeczypospolitej / A. Kołodziejczyk. — Warszawa : Ludowa Spółdzielnia Wydawnicza, 2002. — 516 s.

23. Młodzież na bezdrożach // Zjednoczenie Katolickie. — 1935. — № 5. — S. 2.

24. Archiwum Akt Nowych (AAN). — Z. 14. Ministerstwo Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego w Warszawie. — Sign. 189. Wydział Oświaty Pozaszkolnej — ministerialne konferencje kierowników kuratoryjnych oddziałów oświaty pozaszkolnej w Warszawie 22 — 23.VI.1933 r.

25. Wskazania w zakresie pracy społeczno-oświatowej w r. 1930/31. Wileńskiej Okręgowej Komisji społeczno-oświatowej Związku N.P. // Polska Oświata Pozaszkolna. — 1930. — № 4 — 5. — S. 237—242.

26. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). — Ф. 67 сч. Камандаванне акругі корпуса № 9. — Воп. 2. — Спр. 1094.

27. APB. — Z. 47. Urząd Wojewódzki Białostocki (1920 — 1939). — Sygn. 70. Miesięczne sprawozdania sytuacyjne wojewody białostockiego za 1933 r.

28. Nowe idee organisty. Ku uwadze i przestrodze kierowników "Akcji Katolickiej" // Głos ziemi Grodzieńskiej. — 1931. — 8 września. — S. 2.

29. Ksiądz likwidatorem placówek społecznych w Iwju // Kurjer Wileński. — 1933. — 20 lutego. — S. 4.

30. Cichoracki, P. Województwo poleskie 1921 — 1939. Z dziejów politycznych / P. Cichoracki. — Łomianki : LTW, 2014. — 486 s.

31. Duchowieństwo wobec "Strzelca" // Kurjer Wileński. — 1933. — 22 lipca. — S. 2.

32. *Machowiecki, Z.* Dorobek Związku Młodej Wsi Ziemi Wileńskiej za 1937/38 rok / Z. Machowiecki // Koło Młodzieży. Miesięcznik Związków Młodej Wsi Ziem : Wileńskiej i Nowogródzkiej. — 1938. — № 6 — 7. — S. 12—14.

33. APB. — Z. 47. Urząd Wojewódzki Białostocki (1920—1939). — Sygn. 64. Miesięczne sprawozdania sytuacyjne wojewody białostockiego za 1932 r.

34. APB. — Z. 47. Urząd Wojewódzki Białostocki (1920—1939). — Sygn. 96. Kwartalne sprawozdania wojewody białostockiego za 1935 — 1936 r.

35. *Wojdyło, W.* Wychowanie jako forma działania politycznego w myśli społeczno-politycznej obozu narodowego w latach 1926—1939 // Wychowania a polityka. Między wychowaniem narodowym a państwowym : pod. red. W. Wojdyły. — Toruń : Wydawnictwo Uniwersytetu Mikołaja Kopernika, 1999. — S. 57—68.

36.*Sadowska, J.* Wychowanie państwowe i jego odbicie w programach szkolnych doby sanacji / J. Sadowska // Res Historica. — 2004. — № 16. — S. 83—93.

37. *Odziemkowski, J.* Wieś i armia w II Rzeczypospolitej / J. Odziemkowski. — Wrocław : Ossolineum, 1988. — 154 s.

38. *Pilch, A.* Studencki ruch polityczny w Polsce 1932—1939 / A. Pilch. — Warszawa : PWN, 1972. — 179 s.

39. *Jędrychowska, A.* Zygzakiem i po prostu / A. Jędrychowska. — Warszawa : Czytelnik, 1966. — 384 s.

40. *Pilch, A.* Prasa studencka w Polsce 1918—1939 / A. Pilch. — Kraków : PWN, 1990. — 170 s.


УДК 37.091.64(476):94

**А. А. Лукашов**
Учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи

## ЗНАНИЕ И ИНФОРМАЦИЯ В СОВРЕМЕННОМ ОБРАЗОВАТЕЛЬНОМ ПРОЦЕССЕ: ИХ ИСТОЧНИКИ И РЕСУРСЫ

В последние годы из-за всё более широкого использования Интернета в качестве источника знаний меняются условия функционирования и роль таких традиционных и базовых институтов по обеспечению учащихся информацией, как учебники и библиотеки. Очевидно, что их роль в образовательном процессе остаётся важной, они должны претерпеть соответствующие изменения в целях поддержания эффективности образовательного процесса.

В 2017 г. была закрыта Научно-педагогическая библиотека Главного информационно-аналитического центра Министерства образования. Данная библиотека была ценна тем, что в ней хранилась не только педагогическая литература, но и издания учебников за многие годы, начиная с дореволюционного периода. Наибольшее беспокойство вызывает то, что данная реорганизация вызвала разделение фондов и их передачу в разные библиотеки, в которых они не являются доступными любому гражданину в той же степени, что в специализированной педагогической библиотеке. В числе получателей этих книг числятся библиотека Белорусского государственного педагогического университета и Национальная библиотека Беларуси. Представляется целесообразным даже в ситуации экономии государственных средств и уменьшения количества читателей осуществить реорганизацию таким образом, чтобы сохранить целостность данной библиотеки и возможность её использования широкой педагогической общественностью (например, объединить с какой-либо городской библиотекой).

© Лукашов А. А., 2019



Репозиторий БарГУ